# Амбудсмен у Беларусі: навошта краіне абаронца правоў чалавека?

Сёння ў Беларусі няма інстытута Амбудсмена — незалежнага органа, які абараняе правы грамадзян перад дзяржавай. Аднак новы праект закона «Аб Упаўнаважаным па правах чалавека», распрацаваны Цэнтрам «Еўрапейскі Дыялог», прапануе стварыць такую пасаду і вызначыць яе паўнамоцтвы. Калі законапраект будзе прыняты, гэта стане важным крокам у напрамку абароны правоў і свабод грамадзян Беларусі.

**Чаму гэта важна?**

Цяпер, калі чалавек сутыкаецца з несправядлівасцю з боку дзяржаўных органаў — напрыклад, незаконным затрыманнем, катаваннямі, парушэннем права на абарону ў судзе, — ён вымушаны самастойна шукаць шляхі вырашэння праблемы. У ідэале гэтым павінны займацца суды, пракуратура і іншыя дзяржаўныя органы. Аднак на практыцы далёка не заўсёды атрымліваецца дамагчыся справядлівасці.

Амбудсмен — або, як яго называе законапраект, Упаўнаважаны па правах чалавека — павінен выконваць ролю незалежнага пасрэдніка паміж дзяржавай і грамадствам. Яго задача — сачыць за выкананнем правоў грамадзян і дапамагаць іх абараняць, у тым ліку праз звароты ў Канстытуцыйны Суд.

Упаўнаважаны будзе займацца не толькі абаронай, але і прасоўваннем правоў чалавека. Гэта азначае, што ён будзе спрыяць фармаванню культуры павагі да правоў і свабод, весці тлумачальную працу, дапамагаць людзям лепш разбірацца ў сваіх правах і механізмах іх абароны. аксама ён зможа ўносіць прапановы па змяненні заканадаўства, каб яно было больш прыстасавана да міжнародных стандартаў.

**Як будзе працаваць Упаўнаважаны?**

Паводле праекта закона, Упаўнаважаны па правах чалавека будзе незалежнай службовай асобай, якая абіраецца парламентам на сем гадоў. Ён не можа займаць гэтую пасаду два тэрміны, што зніжае рызыку ператварэння пасады ў палітычны інструмент. Кандыдат павінен мець вышэйшую адукацыю, пяцігадовы досвед у сферы абароны правоў чалавека і бездакорную рэпутацыю.

Упаўнаважаны зможа:

- прымаць скаргі ад грамадзян і расследаваць выпадкі парушэння іх правоў;
- запытваць у дзяржаўных органаў інфармацыю, неабходную для праверкі фактаў парушэнняў;
- свабодна наведваць турмы, следчыя ізалятары і іншыя закрытыя ўстановы, дзе існуе рызыка катаванняў і жорсткага абыходжання;
- ініцыяваць парламенцкія слуханні, калі парушэнні маюць масавы характар;
- звяртацца ў суд і Канстытуцыйны Суд, калі законы або рашэнні органаў улады парушаюць правы грамадзян;
- праводзіць прававую асвету, тлумачачы грамадзянам іх правы і даступныя спосабы іх абароны;
- распрацоўваць рэкамендацыі па паляпшэнні заканадаўства і практыкі яго прымянення ў сферы правоў чалавека.

Сёння ў Беларусі няма незалежнага органа, які б абараняў правы чалавека на сістэмным узроўні. Існуюць пракуратура, суды, праваабарончыя арганізацыі, але яны альбо залежаць ад дзяржавы, альбо сутыкаюцца з абмежаваннямі ў сваёй дзейнасці.

Новы інстытут павінен запоўніць гэты прабел, прапануючы грамадзянам дадатковы механізм абароны. Пры гэтым Упаўнаважаны па правах чалавека не замяняе іншыя органы, а дапаўняе іх — напрыклад, можа ініцыяваць праверкі і патрабаваць перагляду рашэнняў у судовым парадку.

**Што далей?**

Праект закона пададзены на публічнае абмеркаванне. Гэта азначае, што кожны жадаючы можа выказаць сваё меркаванне і прапанаваць змяненні. Пытанне ў тым, ці будзе гэты закон прыняты ў будучыні і ці зможа ён сапраўды змяніць сітуацыю з правамі чалавека ў краіне.

Адно можна сказаць дакладна: з’яўленне такога дакумента — гэта ўжо крок наперад. Цяпер пытанне ў тым, наколькі ён будзе рэалізаваны на практыцы.